УДК 94(476) «1863/1864»

**_С.М. Токць_**
_ст. навук. супрацоўнік Навукова-даследчай часткі_
_Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы,_
_дактарант каф. новай і навейшай гісторыі Беларусі_
_Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта_

# ЗАСЦЯНКОВАЯ ШЛЯХТА БРЭСЦКАГА І КОБРЫНСКАГА ПАВЕТАЎ У МАТЭРЫЯЛАХ ГУБЕРНСКАЙ АДМІНІСТРАЦЫІ 1863–1864 гг.

_У артыкуле аналізуюцца статыстычныя дадзеныя адносна засцянковай шляхты Брэсцкага і Кобрынскага паветаў Гродзенскай губерні, сабраныя мясцовай дзяржаўнай адміністрацыяй у 1863–1864 гг. Гэтыя дадзеныя дазваляюць выявіць дэмаграфічныя структуры азначанай сацыяльнай групы, а таксама вызначыць ступень удзелу яе прадстаўнікоў у паўстанні 1863–1864 гг. Большасць мясцовай шляхты пражывала ў невялікіх нуклеарных сем'ях. Адсутнічала ў межах свайго сталага пражывання адносна невялікая колькасць асобаў. На падставе дадзеных крыніц нельга гаварыць пра масавы ўдзел прадстаўнікоў засцянковай шляхты названых паветаў у паўстанні._

## Уводзіны

Дробная засцянковая шляхта з'яўлялася вельмі важнай саслоўнай групай ў сацыяльнай структуры беларускага грамадства ў XIX ст. Гісторыя гэтай групы ў апошнія гады выклікае вялікую зацікаўленасць з боку даследчыкаў [1; 2]. У часе паўстання 1863–1864 гг. менавіта з прадстаўнікоў шляхты ў значнай ступені фармаваліся паўстанцкія атрады. Таму шляхта прыцягвала асаблівую да сябе ўвагу з боку дзяржаўнай улады. У гэты перыяд ў матэрыялах мясцовай адміністрацыі былі сабраныя грунтоўныя статыстычныя матэрыялы, якія дазваляюць стварыць абагульнены сацыяльны партрэт дадзенай сацыяльнай групы.

Паколькі засцянковая шляхта адыгрывала вельмі значную ролю ў паўстанні, віленскі генерал-губернатар Міхаіл Мураўёў загадаў накласці на гэтую групу грашовую кантрыбуцыю. Гэта быў прыклад ужывання ўладамі прынцыпу калектыўнай адказнасці. Мясцовая адміністрацыя павінна была падаць спісы сямей шляхты з указаннем колькасці спагнаных з яе грашовых сумаў. Гэтыя сумы маглі адрозніваца ў розных ваколіцах. Напрыклад, у Кобрынскім павеце кантрыбуцыя складала з аднаго двара ад 10 да 25 руб. Найбольшыя сумы (па 25 руб.) былі спагнаны з Антона Галембёўскага і Аляксандра Мільневіча, а таксама з Івана Канцэвіча (15 руб.) з ваколіцы Андронава, якія асабіста падазраваліся «в участии в мятеже». У Івана Стэфаноўскага з вёскі Асаўцы ў «шайцы» быў брат, у Ігната Андраноўскага з ваколіцы Андронава – сын. Усе астатнія падазраваліся ўладамі «в сношениях с мятежниками во время прохождения через их места шаек». Усяго было спагнана 305 руб. з 16 двароў шляхты і 11 двароў аднадворцаў ваколіц Андронава, Ляхавіцы, Хадынічы, Верхполле, Вярхі, Задарнова [3, арк. 54].

У Брэсцкім павеце з 143 двароў шляхты было спагнана 1 430 руб. кантрыбуцыі. Гэтая шляхта пражывала ў наступных ваколіцах: Звонніца (4 двары), Сколдычы (10), Цярпіловічы Малыя (13), Цярпіловічы Вялікія (39), Івахновічы (9), Завяртаны (7), Лясота (22), Чэрнева (4), Забалоцце (3), Звады (6), Токары (14), а таксама ў розных вёсках, аднаселях і ў мястэчку Камянец [3, арк. 126–127].

Расійскія ўлады разглядалі дробную шляхту ў якасці асноўнай сацыяльнай базы студзеньскага паўстання, таму яе прадстаўнікі падлягалі асобаму кантролю з боку мясцовай адміністрацыі ва ўмовах ваеннага становішча. Былі строга абмежаваны магчымасці перамяшчэння шляхты па-за месцамі пастаяннага пражывання. Генерал-губернатар Міхаіл Мураўёў выдаў цыркулярнае распараджэнне аб складанні асобых «дамавых

кнігаў», на падставе праверкі якіх можна было ўстанавіць адсутнасць якой-кольвек асобы ў роднай ваколіцы. 11 снежня 1863 г. Мураўёў загадаў даставіць яму копіі гэтых кніг з усіх паветаў [4]. Ваенныя начальнікі паветаў дасылалі азначаныя кнігі спачатку губернатару, а апошні перасылаў іх у Вільню.

У канцылярыі гродзенскага губернатара захаваліся такія кнігі па Кобрынскім і Сакольскім паветах, а таксама адосна большай часткі Брэсцкага павета. Гэтыя дакументы ўяўляюць сабой вельмі цікавую статыстычную крыніцу для вывучэння дробнай шляхты часоў студзеньскага паўстання. Як можна меркаваць, яны складаліся мясцовымі ўладамі на падставе матэрыялаў рэвізскага перапісу 1858 г. і ўключалі інфармацыю як пра зацверджаную ў дваранстве дробную шляхту, так і пра аднадворцаў. У надзвычайных умовах паўстання ўлады разглядалі іх як адну сацыяльную групу.

Ваенны начальнік Кобрынскага павета 24 сакавіка 1864 г. даслаў гродзенскаму губернатару «список лицам, именующимся шляхтою и отыскивающим дворянское происхождение». Згодна з гэтым спісам, у Кобрынскім павеце налічваліся 102 сям'і неаседлай шляхты (не мела нерухомай уласнасці) і 159 сямей аседлай. Паводле роду заняткаў група неаседлай шляхты падзялялася так: эканомы ў панскіх маёнтках – 31 чалавек, служба (без акрэслення дэталяў) – 8, наёмныя «подельные» заработки – 6, палясоўшчыкі – 6, арандатары зямлі – 4, трымальнікі фермаў – 4, арандатары маёнткаў – 3, упраўляючыя маёнткамі – 2, вінакуры – 2, стражнікі – 2, настаўнікі – 2, гаспадарка («хозяйство») – 3. Па адным чалавеку налічвалася прадстаўнікоў наступных заняткаў: гуменны, млынар, садоўнік, агароднік, пісар у маёнтку, землямер, наглядчык лесу, пісар у мястэчку, пісар на ферме, карчмар, вясковы пісар, валасны пісар, пісьмавод пры станавым приставе, арганіст у касцёле. Адносна трох асобаў было пазначана, што яны жывуць у сваякоў, адзін шляхціч быў малалетнім, адзін у «богадельне при костёле», адзін на «призрении у помещика». Адносна яшчэ двух асобаў было запісана: «по бедности ничем не занимаются» [4, арк. 2–33]. Незразумела, з якой прычыны да гэтай катэгорыі «неаседлай шляхты» быў далучаны Аляксандр Лягуцкі (63 гады), якому належалі 80 дзесяцін зямлі [4, арк. 18].

Аседлай шляхты налічвалася ў Кобрынскім павеце 159 сямей. Паводле роду заняткаў гэтыя сем'і падзяляліся так: занятак сельскай гаспадаркай – 119 чалавек, эканомы – 19, упраўляючыя маёнткамі – 4, арандатары маёнткаў – 5, служба ў маёнтку – 1, трымальнік казённай карчмы – 1, наглядчык пры вінакурні – 1, пісар пры вінакурні – 1, прыватнае вымярэнне зямель – 1, падзённыя заробкі – 1, тысяцкі – 1, палясоўшчыкі – 3, пісар на казённай ферме – 1, пісьмавод пры станавым прыставе – 1. Памеры землеўладання сярод гэтай шляхты былі наступнымі: уладальнікі да 5 дзесяцін зямлі – 12 гаспадароў, 5–10 дзесяцін – 23, 10–20 дзесяцін – 47, 20–50 дзесяцін – 25, 50–100 дзесяцін – 13, больш 100 дзесяцін – 10. Адносна 11 асоб было запісана, што яны маюць «зямлю і пабудовы». Маёнткі з сялянамі ва ўласнасці мелі 3 асобы, фальваркі – 2, дамы з пабудовамі (без зямлі) – 8. Зусім не мелі нерухомасці 5 асобаў з гэтай катэгорыі. Зноў паўстае пытанне пра крытэрыі далучэння апошніх да «аседлай шляхты». Толькі адзін прадстаўнік гэтай групы Ігнат Калянкевіч меў чын тытулярнага саветніка.

На час складання спісаў адсутнічалі ў сваіх дамах 28 чалавек. З іх ліку чатыры, паводле дадзенага дакумента, знаходзіліся «ў мецяжы». Гэта былі наступныя асобы: сын эканома Дамініка Смялоўскага Гіпаліт (20 год), Аляксандр Бараноўскі (45 г.), Людвік Багноўскі (44 г.) (меў шасцёра дзяцей), сын уладальніка фальварка Міхайлаўшчына Клеафаса Мыслоўскага Павел (17 г.). Яшчэ 13 асобаў былі арыштаваныя ўладамі. Хаця прычыны арышту не называліся, але можна меркаваць, што ў большасці выпадкаў яны былі звязаныя з паўстаннем. У паўстанні маглі быць яшчэ тры асобы, пра якіх было запісана, што яны знаходзяцца «в неизвестной отлучке». У табліцы 1 прыведзены звесткі

пра прадстаўнікоў кобрынскай дробнай шляхты, якія знаходзіліся на час складання перапісу па-за межамі свайго сталага пражывання.

Табліца 1. – Шляхта Кобрынскага павета, якая знаходзілася па-за межамі свайго сталага пражывання [4]

| | Апісанне адсутных |
|---|---|
| | АСЕДЛЫЯ |
| 1 | Сын Вікенція Ягалкоўскага Гіпаліт служыць у маёнтку Сягневічы Пружанскага павета. Жыве там разам з жонкай і 3 дзецьмі. |
| 2 | Дачка Ксаверыя Ягалкоўскага Юзэфа (28 г.) знаходзіцца на службе ў Слуцку Мінскай губерні |
| 3 | Сын Франца Гронастайскага Баляслаў (20 г.) знаходзіцца ў Новай Рудзе Брэсцкага павета, другі сын Рамуальд (27 г.) знаходзіцца «в неизвестной отлучке». |
| 4 | Сын Вікенція Ягалкоўскага Людвік (19 г.) у Гродне ў турэмным астрозе. |
| 5 | Гаспадар Адам Ягалкоўскі арыштаваны ў Брэсце. |
| 6 | Сын удавы Паўліны Гронастайскай Казімір (13 г.) навучаецца ў Свіслацкай прагімназіі. |
| 7 | Пасынак Юзафа Завістоўскага Франц Сінкевіч (22 г.) знаходзіцца ў Адэсе. |
| 8 | Брат Уладзіслава Ягалкоўскага Юзаф (27 г.) разам з сям'ёй у маёнтку Брэсцкага павета, другі брат Ян (20 г.) у Гродзенскім астрозе. |
| 9 | Брат Фелікса Чарвінскага Антон (60 г.) на службе ў Пружанскім павеце. |
| 10 | Брат Антона Астраменцкага Тэафіл (42 г.) на службе ў Брэсцкім павеце. |
| 11 | Сын Антона Андронаўскага Гіпаліт «в неизвестной отлучке». |
| 12 | Дочкі Юзафа Задарноўскага Эва (25 г.), Юзэфа (19 г.) і Юлія (15 г.) на службе ў Кобрыне. |
| 13 | Сын Антона Камінскага Юры (16 г.) у Кобрыне пад арыштам. |
| 14 | Сыны Тэафілі Івашкевіч Рафал (23 г.) і Аляксандр (21 г.), а таксама іх сваяк Бернард Івашкевіч «в неизвестной отлучке». |
| 15 | Гаспадар Клеафас Мыслоўскі (48 г.), уладальнік фальварка Міхайлаўшчына, арыштаваны, старэйшы сын Павел (17 г.) «у мецяжы». |
| 12 | Леанард Рашкевіч (35 г.), тысяцкі, арыштаваны. |
| 13 | Сын Альбіна Хадыніцкага Павел (19 г.) навучаецца ў Казанскім універсітэце. Другі сын Канстанцін (18 г.) у Гродзенскай гімназіі, дочкі Тэрэза (14 г.) і Фларэнтына (13 г.) у Гродзенскім пансіёне. Альбін Хадыніцкі (54 г.) меў дом і 10 дзесяцін зямлі ў ваколіцы Крушыняны. |
| 14 | Сын Ганны Задарноўскай (80 г.) адстаўны ротмістр Пётр (57 г.) пражывае ў Падольскай губерні. У іх уласнасці было 85 дзесяцін зямлі ў ваколіцы Задарнова. |
| 15 | Сын Ігната Завіскага (52 г.) Фелікс (18 г.) знаходзіцца ў Тыфлісе, другі сын Карл (17 г.) у Кіеве. Ігнат Завіскі меў дом і 4 дзесяцін зямлі. |
| 16 | Сын Аляксандра Даноўскага (52 г.) Бенедыкт (20 г.) арыштаваны. У іх было 220 дзесяцін зямлі ў маёнтку Вінча. |
| 17 | Васіль Пянькоўскі (48 г.) арыштаваны, меў 12 дзесяцін зямлі ва ўрочышчы Домбрава. |
| 18 | Брат Антона Галембоўскага (50 г.) Юзаф (36 г.) арыштаваны. У іх была 61 дзесяцін зямлі. |
| 19 | Сын Станіслава Сямашкі (60 г.) Антон (25 г.) арыштаваны. У іх дом на «казённай» зямлі. |
| | НЕАСЕДЛЫЯ |
| 20 | Наглядчык лесу Антон Бучынскі (52 г.), арыштаваны. |
| 21 | Стражнік Пётр Стэфаноўскі (29 г.). |
| 22 | Палясоўшчык Валерыян Чарніцкі (55 г.) і яго сын Апалінары (21 г.), арыштаваны. |
| 23 | Наглядчык вінакурні Альберт Скабейка (28 г.), арыштаваны. |
| 24 | Сын эканома Юзафа Кардашэвіча (64 г.) Гіпаліт (20 г.) навучаецца ў Харкаўскім універсітэце. |
| 25 | Людвік Багноўскі (44 г.), служыў у маёнтку, знаходзіцца ў «мецяжы», меў жонку і шасцёра дзяцей. |
| 26 | Сын эканома Даменіка Смялоўскага Альберт (20 г.), «у мецяжы». |
| 27 | Аляксандр Бараноўскі (45 г.), род заняткаў – «нічым не займаецца», «у мецяжы», меў жонку і сына. |
| 28 | Эканом Фелікс Маеўскі (49 г.) арыштаваны, яго сын Юльян (13 г.) навучаецца ў гімназіі. |

Абсалютная большасць кобрынскай шляхты належала да каталіцкага веравызнання. Толькі ў некаторых сем'ях сустракаліся прадстаўнікі іншых канфесій. Напрыклад, у палясоўшчыка Бенядыкта Астраменцкага была праваслаўная жонка. У Івана Сцяпурскага праваслаўнымі былі жонка, дзве дачкі і цешча. Ён меў 7 дзесяцін зямлі, але працаваў эканомам у панскім маёнтку. У Антона Яблонскага (74 г.) жонка Эва (47 г.) была лютэранкай. У ваколіцы Босяч ім належала 17 дзесяцін зямлі. У той жа ваколіцы лютэранін Вікенці Вольмер меў жонку і чацвёра дзяцей каталіцкага веравызнання. У Франца Вішаватага і Міхала Чарвінскага жонкі былі праваслаўнымі. У Міхала Міхалоўскага жонка была праваслаўная, старэйшы сын каталіком, а малодшы сын і дзве дачкі – праваслаўнымі. У мястэчку Дывін Міхалоўскаму належалі 47 дзесяцін зямлі. Толькі адзін з прадстаўнікоў гэтай групы эканом Якуб Шпакоўскі быў праваслаўным. Ён меў 10 дзесяцін зямлі.

Усяго ў Кобрынскім павеце засцянковай шляхты налічвалася 569 мужчын і 512 жанчын (табліца 2). Прычым мужчын ва ўзросце ад 15 да 50 гадоў было 292 асобы. У «мецяжы», паводле дадзеных мясцовых уладаў, знаходзіліся 4 асобы з гэтай катэгорыі (1,4%); калі ж дадаць сюды 13 арыштантаў, то атрымаецца, што 17 асобаў (5,8%) маглі мець дачыненне да паўстання. А разам з тымі, хто знаходзіўся «в неизвестной отлучке», гэты працэнт узрастаў да 6,8.

Табліца 2. – Полава-ўзроставая структура шляхты Кобрынскага павета ў 1864 г. [4]

| Узрост | Разам | Мужчыны | Жанчыны |
|---|---|---|---|
| Агульная лічбы | | | |
| 0–4 | 133 | 61 | 72 |
| 5–9 | 99 | 54 | 45 |
| 10–14 | 103 | 52 | 51 |
| 15–19 | 133 | 58 | 75 |
| 20–29 | 193 | 101 | 92 |
| 30–39 | 125 | 65 | 60 |
| 40–49 | 117 | 68 | 49 |
| 50–59 | 97 | 57 | 40 |
| 60–69 | 51 | 33 | 18 |
| 70–79 | 24 | 15 | 9 |
| 80– | 6 | 5 | 1 |
| Разам | 1 081 | 569 | 512 |

Намі быў таксама праведзены аналіз структуры сямейных дворагаспадарак аседлай шляхты Кобрынскага павета, з якога вынікае, што для гэтай шляхты характэрнымі былі невялікія нуклеарныя сем'і, якія складаліся з сямейнай пары і іх дзяцей (табліца 3). Такіх сямей налічвалася 85 (53,5%). Вялікіх складаных сямей, у якіх супольна пражывала некалькі шлюбных параў, было ўсяго 18 (11,3 %).

Табліца 3. – Структура сямейных дворагаспадарак аседлай шляхты Кобрынскага павета ў 1864 г. [4]

| Катэгорыі | 1 пакаленне | 2 пакалення | 3 пакалення | Разам |
|---|---|---|---|---|
| 1. Гаспадаркі самотных асобаў | 15 | – | – | 15 |
| 2. Несямейныя гаспадаркі (без шлюбнай пары) | 3 | – | – | 3 |
| 3. Простыя (нуклеарныя) сем'і | 11 | 74 | – | 83 |
| 4. Пашыраныя сем'і | 1 | 28 | 5 | 34 |
| 5. Складаныя сем'і | – | 12 | 7 | 18 |
| 6. Іншыя | 2 | 1 | – | 3 |
| Разам | 32 | 115 | 12 | 159 |

Па Брэсцім павеце інфармацыя захавалася па 4-х паліцэйскіх станах з пяці [4, арк. 274–313]. У гэтых чатырох станах налічвалася 112 сямей дробнай засцянковай шляхты, якія можна размеркаваць у залежнасці ад таго, чым займаўся гаспадар: эканомы – 39, лясныя стражнікі – 12, земляробы – 7, упраўляючыя маёнткамі – 6, арандатары маёнткаў – 6, надляснічыя – 4, «прыказчыкі» – 3, наглядчыкі за вінакурнямі – 3, гуменныя – 3, сіроты пад апекай – 2, пісары ў маёнтках – 2, цесляры – 2, маляр – 1, кучар – 1, трымальнік казённай фермы – 1, аб’ездчык казённага лесу – 1, арандатар панскага саду – 1, справавод пры паліцэйскім прыставе – 1, столяр – 1, млынар – 1, пісьмавод – 1, пастух – 1. Акрамя таго, адносна трох шляхціцаў было адзначана, што яны выехалі назаўсёды з павета, пра трох не было ніякай інфармацыі, а яшчэ пра аднаго было запісана, што ён шукае службу. З 106 шляхціцаў, пра якіх была інфармацыя адносна іх уласнасці, 67 (63,2 %) не мелі нерухомасці, 4 асобы мелі зямельныя уладанні памерам ад 20 да 40 дзесяцін, 6 асобаў валодалі ад 10 ад 15 дзесяцінамі, 7 сямей – ад 5 да 10 дзесяцін, 11 сямей – менш чым 5 дзесяцінамі. У дакуменце не ўказваліся памеры зямлі, якой валодалі 11 асобаў.

Адсутнічалі ў сваіх дамах 17 асобаў з ліку брэсцкай шляхты, з іх 9 знаходзіліся пад арыштам (табліца 4). Напрыклад, Вікенці Абухоўскі (48 г.) утрымліваўся ў гродзенскай турме, а яго сын Ксаверы быў ужо высланы ў Табольскую губерню. Дома засталіся толькі жонка і дзве дачкі. Упраўляючы маёнтка генерала Малахоўскага Карл Ляскоўскі знаходзіўся ў брэсцкай турме, а яго сын Аляксандр з красавіка 1863 г. быў «в отлучке».

Табліца 4. – Шляхта Брэсцкага павета, якая знаходзілася па-за межамі свайго сталага пражывання [4]

| | |
|---|---|
| 1 | Дачка Юзафа Тапчэўскага Марыя (20 г.) служыла ў памешчыка Жабкевіча. |
| 2 | Арандатар маёнтка Ліскі Міхал Адамовіч (55 г.) пад арыштам у Пружанах. |
| 3 | Лясны наглядчык памешчыка Кавальскага Лука Ількоўскі пад арыштам у Брэсце. Дворкаўскае валаснoе праўленне пісала пра яго: «В сочувствии мятежу замечен». |
| 4 | Арандатар маёнтка Падбелае памешчыка Старавольскага Рыгор Кахімоўскі (63 г.) арыштаваны ў Пружанах. Яго сыны Ян (21 г.), Казімір (18 г.), Юзаф (16 г.) «в неизвестной отлучке». |
| 5 | Самсон Эйсман (35 г.) з маёнтка Надолін – у Брэсце пад арыштам. |
| 6 | Сын арандатара маёнтка Галоўчыцы Марцэлія Тваркоўскага Клімент (18 г.) знаходзіцца ў Чыжах Бельскага павета. |
| 7 | Эканом маёнтка Грынцэвічы Рох Мачульскі (48 г.) утрымліваўся пад арыштам з 8 верасня 1863 г. па 20 лютага 1864 г., а цяпер знаходзіцца пад парукай. |
| 8 | Дочкі Міхала Радзевіча з маёнтка Войская Канстанцыя (40 г.) замужам у Пружанскім павеце, Саламея ў Брэсце, сын Фелікс – калежскі сакратар у Брэсце. |
| 9 | Сын палясоўшчыка Антона Фалькоўскага Фердынанд у Трасцяніцы. |
| 10 | Адольф Класоўскі з Камянца знаходзіцца ў Бельску пад арыштам, «общество аттестует благонадежным»; яго жонка і два сыны праваслаўныя. |
| 11 | Ян Класоўскі з Камянца пад арыштам у Бельску, аседласці не мае, шукае службу, «не замечен, о благонадежности его по недавнему прибытию определительно неизвестно обществу». |
| 12 | Эканом маёнтка Пруські Марцэлі Чарноцкі (26) у Брэсце пад арыштам. |
| 13 | Вінакур Юзаф Татарэнка выбыў у Брэст. |
| 14 | Дачка Яна Ізбіцкага Браніслава «в отлучке». |
| 15 | Вікенці Абухоўскі (48 г.) пад арыштам у Гродзенскай турме, яго сын Ксаверы высланы ў Табольскую губерню, засталіся яго жонка і дзве дачкі. |
| 16 | Сям’я Франца Цярпілоўскага пражывае ў 5-ым стане Брэсцкага павета, дакладных дадзеных пра іх няма. |
| 17 | Упраўляючы маёнткам Сычы генерала Малахоўскага Карл Ляскоўскі (50 г.) знаходзіцца ў Брэсцкай турме, яго сын Аляксандр с красавіка 1863 г. «в отлучке». |

Таксама, як у Кобрынскім павеце, абсалютная большасць брэсцкай шляхты належала да каталіцкага веравызнання. У эканома Яна Палькоўскага (38 г.) жонка (35 г.)

і сын (2 г.) былі праваслаўнымі. Праваслаўнай была сям'я ляснога наглядчыка Лукі Ільkоўскага. Упраўляючы маёнткам Станіслаў Сабалеўскі меў жонку і чатырох дзяцей, якія былі праваслаўнымі. Тасама праваслаўнымі былі жонка і дзеці Адольфа Класкоўскага з Камянца. З ліку гаспадароў праваслаўным быў толькі вінакур Юзаф Татарэнка. Стражнік казённага лесу Стэфан Міцкевіч быў магаметанінам, а яго жонка Алена каталічкай. Паводле полавай структуры сярод гэтай шляхты налічвалася 176 асоб жанчыночага полу і 201 мужчынскага (табліца 5). Мужчын ва ўзросце ад 15 да 50 год было 100 чалавек. Такім чынам, пад арыштам знаходзілася 9% ад гэтай полова-узроставай групы.

Табліца 5. – Полава-ўзроставая структура засцянковай шляхты Брэсцкага павета ў 1864 г. [4]

| Узрост | Разам | Мужчыны | Жанчыны |
|---|---|---|---|
| Агульная лічбы | | | |
| 0–4 | 52 | 27 | 25 |
| 5–9 | 50 | 24 | 26 |
| 10–14 | 29 | 14 | 15 |
| 15–19 | 38 | 19 | 19 |
| 20–29 | 50 | 23 | 27 |
| 30–39 | 66 | 31 | 35 |
| 40–49 | 42 | 27 | 15 |
| 50–59 | 29 | 21 | 8 |
| 60–69 | 14 | 9 | 5 |
| 70–79 | 6 | 5 | 1 |
| 80– | 1 | 1 | – |
| Разам | 377 | 201 | 176 |

Статыстычныя звесткі, сабраныя ўладамі адносна дробнай засцянковай шляхты, служылі падставай для далейшых урадавых рэпрэсій супраць дадзенай групы. Гэтыя рэпрэсіі на беларускіх землях у часе і пасля паўстання 1863–1864 гг., а таксама актывізацыя палітыкі «разбору» шляхты (пераводу яе прадстаўнікоў у падатныя станы) прывялі да вельмі істотнага скарачэння яе колькасці ў беларуска-літоўскіх губернях з 228,5 тыс. чалавек у 1863 г. да 121,7 тыс. у 1867 г. [5]. Перапіс насельніцтва 1897 г. зафіксаваў у пяці «паўночна-заходніх» губернях 241 029 дваран абодвух палоў, што складала 2,9% ад усяго насельніцтва [6]. Дробная засцянковая шляхта ў той час ужо ўлічвалася у складзе мяшчанскага і сялянскага насельніцтва.

**Заключэнне**

Статыстычныя даследаванні шляхецкага саслоўя, якія праводзіліся мясцовымі дзяржаўнымі ўладамі, несумненна, адыгралі істотную ролю ў рэалізацыі ўрадавай палітыкі адносна шляхты. У цэлым яны дастаткова поўна адлюстравалі колькасць шляхты і яе ўнутраную структуру. Нягледзячы на мноства недакладнасцей, сабраныя ўладамі статыстычныя дадзеныя ўяўляюць сабой выключна важную крыніцу для даследавання шляхецкага саслоўя.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Макарэвіч, В. С. Палітыка разбору імперскімі ўладамі маргінальных катэгорый шляхты Беларусі ў 30-я–80-я гг. XIX ст. / В. С.Макарэвіч // Славянскі свет: мінулае і сучаснае : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф. – Мінск, 2004. – Ч. 3. – С. 98–103; Макарэвіч, В. С. Перасяленне маргінальных катэгорый шляхты з Беларусі ва ўнутраныя і памежныя губерніі Расіі ў 30–60-я гг. XIX ст. / В. С. Макарэвіч // Працы гістарычнага

факультэта БДУ. – Вып. 1. – Мінск, 2006. – С. 46–50; Макарэвіч, В. С. Эвалюцыя форм нацыянальнай ідэнтычнасці шляхты Беларусі ў XVI–XIX стст. / В. С. Макарэвіч // Беларус. гіст. часопіс. – 2007. – № 1. – С. 30–35; Макарэвіч, В. С. «Антыразбор» шляхты: падробкі дваранскіх дакументаў і нелегальныя набілітацыі ў Беларусі ў XIX ст. / В. С. Макарэвіч // ARCHE. – 2008. – № 11. – С. 221–236; Макарэвіч, В. С. «Панскі разбор шляхты»: абеззямельванне чыншавікоў і чыншавая рэформа 1886 г. у Беларусі / В. С. Макарэвіч // Беларус. гіст. часопіс. – 2011. – № 4. – С. 3–14.

2. Радзюк, А. Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў на Гарадзеншчыне ў 1863–1864 гг. / А. Радзюк // ARCHE. – 2010. – № 12. – С. 151–174.

3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне (НГАБГ). – Ф. 1. Воп. 22. Спр. 1373.

4. НГАБГ. – Ф. 1. Воп. 6. Спр. 425.

5. Корелин, А. П. Дворянство в пореформенной России: 1861–1904 гг. Состав, численность, корпоративная организация / А. П. Корелин. – М., 1979. – С. 294–295.

6. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 / под ред. Н. Тройницкого. – СПб. : Издание центр. стат. ком-та М-ва внутр. дел, 1903. – Вып. XI: Гродненская губерния. – 319 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 06.01.2015

***Tokts S.M.*** **The Nobility of Brest and Kobrin Areas in Statistical Materials of Provincial Administration in the 1863–1864s**

*The article deals with statistical data on the nobility of Brest and Kobrin district, Grodno region in the 1863–1864s. These data were collected by the local state administration during the uprising, in which active nobles took part. These data allow us to determine the characteristics of the demographic structure of the nobility. They also allow us to determine the degree of participation of the local nobility in the revolt. Most nobles lived in small families. A small part of the nobility was absent in native houses during the test. On the basis of these sources we can not speak about the mass participation of the nobility of Brest and Kobrin areas in the uprising.*